16.10.2007г № 06-14/1028
На № 03-17п от 10.10.2007г

ПЕРАКЛАД

Вярхоўны Суд
Рэспублікі Беларусь

Аб пярэчаннях па скарзе Грамадскага праваабарончага аб'яднання "Вясна" на рашэнне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі

Міністэрства юстыцыі разгледзела довады скаргі Грамадскага праваабарончага аб'яднання "Вясна" на рашэнне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі (далей - скарга) і паведамляе.

У скарзе азначана, што рашэнне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі дадзенага грамадскага аб'яднання не адпавядае патрабаванням артыкула 15 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях". Дадзены артыкул Закона, у сваю чаргу, прадугледжвае падставы для прыняцця рашэння аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання.

Па меркаванні Грамадскага праваабарончага аб'яднання "Вясна" факт таго, што 20 з 69 заснавальнікаў дадзенага грамадскага аб'яднання прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці, не з'яўляецца падставай для адмовы ў яго рэгістрацыі.

У гэтай сувязі варта адзначыць, што Міністэрствам юстыцыі звернута ўвага на склад заснавальнікаў дадзенага грамадскага аб'яднання, а таксама на то, па якіх артыкулах Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях прыцягваліся дадзеныя асобы.

Пры гэтым Міністэрства юстыцыі паказала ў поўнай адпаведнасці з упамянутым артыкулам 15 Закона Рэспублікі Беларусь падставы для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання "Вясна".

Неадпаведнасць мэт дзейнасці грамадскага аб'яднання патрабаванням заканадаўства з'яўляецца падставай для прыняцця рашэння аб адмове ў яго дзяржаўнай рэгістрацыі.

Часткай трэцяй артыкула 9 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", якая вызначае патрабаванні да статута грамадскага аб'яднання, вызначана, што ён павінен утрымоўваць, у тым ліку, мэты, задачы, прадмет і метады дзейнасці грамадскага аб'яднання.

Аднак пунктам 2.1 прадстаўленага статута вызначана толькі асноўная мэта дзейнасці Грамадскага праваабарончага аб'яднання "Вясна", што падразумявае магчымасць дадзенага грамадскага аб'яднання мець іншыя, не азначаныя ў статуце мэты дзейнасці, асабліва ў свеце здзяйсняемых яго заснавальнікамі адміністрацыйных правапарушэнняў.

Больш таго, асноўнай мэтай Грамадскага праваабарончага аб'яднання "Вясна", згодна пункта 2.1 прадстаўленага статуту, з'яўляецца забеспячэнне правоў і свабод чалавека, якія вынікаюць з Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Аднак, зыходзячы з нарматыўнага прадпісання часткі першай артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" грамадскія аб'яднанні маюць права абараняць правы і законныя інтарэсы, а таксама прадстаўляць у дзяржаўных органах і іншых арганізацыях законныя інтарэсы толькі сваіх членаў.

У гэтай сувязі, азначаная ў статуце мэта дзейнасці дадзенага грамадскага аб'яднання не ўзгадняецца з названым патрабаваннем Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях".

Неадпаведнасць назвы грамадскага аб'яднання патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь з'яўляецца падставай для прыняцця рэгіструючым органам рашэння аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі такога грамадскага аб'яднання.

Так, у кастрычніку 2003 года ў адпаведнасці з рашэннем Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь было ліквідавана Грамадскае аб'яднанне "Праваабарончы цэнтр "Вясна".

Назва зноў створанага грамадскага аб'яднання "Грамадскае праваабарончае аб'яднанне "Вясна", па сутнасці, раўназначна назве ліквідаванага, што з'яўляецца недапушчальным у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях".

Часткай шостай артыкула 12 дадзенага Закона вызначана, што назва грамадскага аб'яднання павінна адрозніваецца ад назваў іншых грамадскіх аб'яднанняў, зарэгістраваных у Рэспубліцы Беларусь альбо ліквідаваных па рашэнні суда, і не павінна супярэчыць гэтаму Закону, іншым актам заканадаўства, устаноўчым дакументам грамадскага аб'яднання, а таксама парушаць права на інтэлектуальную ўласнасць.

Такім чынам, назва створанага грамадскага аб'яднання ўступае ў супярэчнасць з дадзенай нормай Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях".

Грамадскім праваабарончым аб'яднаннем "Вясна" не прадстаўлены ўсе неабходныя ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" дакументы, якія неабходна было накіраваць у Міністэрства юстыцыі для яго дзяржаўнай рэгістрацыі. Гэта ў адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 15 названага Закона з'яўляецца падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання.

Так, у адпаведнасці з часткай шостай артыкула 13 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" для дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання ў Міністэрства юстыцыі прадстаўляецца, у тым ліку, дакумент банка, які пацвярджае плату дзяржаўнай пошліны.

Пунктам 11 Інструкцыі аб парадку афармлення і разгляда дакументаў, звязаных з дзяржаўнай рэгістрацыяй палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), а таксама дзяржаўнай рэгістрацыяй і выключэннем з журнала дзяржаўнай рэгістрацыі, пастаноўкай на ўлік і зняццем з уліку іх арганізацыйных структур, зацверджанай пастановай Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 30 жніўня 2005 года № 48, установлена, што плата дзяржаўнай пошліны за дзяржаўную рэгістрацыю грамадскага аб'яднання пацвярджаецца арыгіналам банкаўскага дакумента. У плацёжным дакуменце павінна быць указана назва грамадскага аб'яднання, за дзяржаўную рэгістрацыю якога плаціцца дзяржаўная пошліна.

Сярод прадстаўленых Грамадскім праваабарончым аб'яднаннем "Вясна" дакументаў маецца квітанцыя аб аплаце рэгістрацыйнага збору (але не дзяржаўнай пошліны, як гэта неабходна ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь). Пры гэтым не ўказана, за што праведзены дадзены плацёж.

Дадзеная квітанцыя не можа быць разгледжана ў якасці дакумента банка, які пацвярджае аплату дзяржаўнай пошліны.

На падставе выкладзенага 23 жніўня 2007 года Міністэрствам юстыцыі прынята рашэнне аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання "Вясна".

Копіі Статута Грамадскага праваабарончага аб'яднання "Вясна", спісаў заснавальнікаў, пратакола ўстаноўчага сходу, дакумента аб аплаце дзяржаўнай пошліны і іншых дакументаў прыкладаюцца.

Дадатак: на 41 с. у 1 экз.

Прадстаўнік Міністэрства юстыцыі,
начальнік аддзела грамадскіх аб'яднанняў
упраўлення грамадскіх аб'яднанняў п/п А.У. Печкуроў